З табою гавораць

**ДЭЛЕГАТЫ XXII З'ЕЗДА КПСС**

# У вас ёсць мудры рулявы

**У. Е. ЛАБАНОК,**

**першы сакратар Віцебскага абкома КПБ, дэлегат XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза**

КАМСАМОЛ... Гордае і мужнае племя. Не вымераць тваіх слаўных спраў, не ахапіць тваіх натхнёных здзяйсненняў і подзвігаў. Наш народ па праву захапляецца табой. Ты служыш баявым прыкладам для мільёнаў маладых байцоў за свабоднае, светлае жыццё ў многіх краінах свету. Але ніхто так не радуецца, так не захапляецца і не ганарыцца табой, як мы, камуністы. З камсамолам у многіх з нас звязана наша маладосць. У яго радах мы прайшлі першую баявую загартоўку, навучыліся па-сапраўднаму дзярзаць, марыць, змагацца. Камсамольцы — гэта нашы першыя памочнікі на ўсіх участках будаўніцтва, на ўсіх галінах шматграннага жыцця. Камсамол — гэта наш баявы рэзерв, наша змена, наша будучыня.

Успамінаюцца мне грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны. Колькі душэўных сіл, якую мужнасць і бясстрашша трэба было мець, каб выстаяць у бітвах з ворагамі! Але камсамольцы не толькі стаялі на смерць, не ведаючы страху ў барацьбе. Яны здзяйснялі подзвігі, якія не памеркнуць у вяках. Міхаіл Сільніцкі, Васіль Чыкаў, Канстанцін Шабанаў, Фёдар Муштараў, Анатоль Кірылаў, Зіна Партнова, Фруза Зянькова і дзесяткі іншых адважных камсамольцаў Віцебшчыны праславіліся сваімі баявымі подзвігамі ў баях з гітлераўцамі. А побач з гэтымі юнымі героямі стаялі камуністы — камандзіры і камісары брыгад і атрадаў — М. Шмыроў, А. Сіпко, П. Раманаў, А. Дунукалаў і іншыя.

Скончылася вайна, і камсамольцы Віцебшчыны па прыкладу сваіх старэйшых таварышаў — камуністаў узялі ў рукі кельмы і малаткі, надзелі рабочыя блузы і выйшлі на аднаўленне гарадоў і сёл, што ляжалі ў руінах. І цудоўнымі архітэктурнымі ансамблямі, праспектамі і вуліцамі ўпрыгожыліся нашы старажытныя, але памаладзеўшыя гарады над Дзвіной і Дняпром — Віцебск, Полацк, Орша. Выраслі новыя добраўпарадкаваныя вёскі, пасёлкі.

ЁСЦЬ яркія прыкметы часу, якімі адзначан подзвіг камсамола ў пасляваенныя гады. Гэта цаліна, асваенне новых неабжытых раёнаў на Поўначы і Усходзе нашай краіны. Па закліку партыі на асваенне цалінных зямель, на будаўніцтва новых гарадоў, заводаў, электрастанцый паехалі сотні маладых добраахвотнікаў Віцебшчыны. І цяпер, як толькі Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў у дакладзе на XXII з'ездзе партыі заклікаў маладых патрыётаў пайсці ў тайгу, горы, пустыні, каб дапамагчы партыі паставіць іх багацці на службу народу, паток заяў з просьбай накіраваць на штурм новых вышыняў прыйшоў у камсамольскія камітэты Віцебшчыны.

Але пярэдні край сямігодкі, будаўніцтва камунізма не толькі на цаліне, у Сібіры і Казахстане. Яго граніцы распасціраюцца значна шырэй. Як сказаў віцебскі паэт:

Нет у нас ни пылающих домен,
Ни ковыльных степей целины,
Но и здесь на просторах придвинских
Комсомольские руки нужны.

Так, патрэбны яны нам на Віцебшчыне, працалюбівыя рукі і гарачыя неспакойныя сэрцы. Пярэдні край, ударныя камсамольскія будоўлі ёсць і ў нас. Гэта «Нафтабуд», другая чарга Віцебскай цэц і Аршанскага льнокамбіната. Тут галоўнай сілай сталі юнакі і дзяўчаты, што прыйшлі працаваць па камсамольскіх пуцёўках.

Вядучая роля належыць камсамольцам і ў справе ўздыму сельскай гаспадаркі. Гэта яны, маладыя і неспакойныя, зрабілі кукурузу сапраўднай гаспадыняй віцебскіх палёў. Гэта яны, тысячы маладых энтузіястаў, прыйшлі ў апошні час на жывёлагадоўчыя фермы калгасаў і саўгасаў, каб прыкласці сваю працу і розум, адкрыць для народа багатыя кладавыя малака і мяса. Толькі ў гэтым годзе сталі ў рады жывёлаводаў 2.218 юнакоў і дзяўчат. Рукамі маладых ужо адкормлена сёлета 127.347 свіней, вырашчана 73.326 цялят, 1.260.000 птушкі і яшчэ прыкладна столькі знаходзіцца на адкорме.

Значных працоўных поспехаў дабіліся нашы маладыя рабочыя. Пры іх актыўным удзеле прадпрыемствы вобласці сустрэлі XXII з'езд партыі выпускам звышпланавай прадукцыі на 13 мільёнаў рублёў.

З каштоўнай ініцыятывай выступіла ткачыха дыванова га камбіната камсамолка Анна Кізікава. Яна рашыла датэрмінова дабіцца прадукцыйнасці працы, якая запланавана на канец сямігодкі. Самаадданая праца, настойлівая вучоба прынеслі перамогу. Прыклад Кізікавай натхніў увесь калектыў. І сёння, у трэцім годзе сямігодкі, усе рабочыя камбіната дасягнулі высокіх рубяжоў сямігодкі.

А на другім прадпрыемстве Віцебска — на швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» распрацавалі свой план сямігодкі ведаў. Гэта азначае, што кожны малады работнік фабрыкі на працягу сямігодкі атрымае як мінімум сярэднюю адукацыю. Якасць прадукцыі пад нагляд грамадскіх кантралёраў — такі рух нарадзіўся на заводзе радыёдэталей.

Не пералічыць смелых задум і выдатных перамог камсамольцаў гарадоў і сёл Віцебшчыны. Гэтыя перамогі — вынік вялікай самаадданай працы, смелых пошукаў, настойлівай вучобы, вынік умелага партыйнага кіраўніцтва.

ВЯЛІКАЕ шчасце нашай моладзі, што ў яе ёсць мудры рулявы. Партыя клапатліва росціць маладое арлінае племя, накіроўвае яго энергію і розум на вялікія і смелыя справы. Сіла камсамола — ва ўмелым і канкрэтным кіраўніцтве партыі. Камуністы на ўсіх участках працы вядуць за сабой маладую згуртаваную адзінствам мэты змену. Яны не толькі ўказваюць ім, як трэба жыць, працаваць, будаваць новае светлае грамадства, але і пастаянна аказваюць неабходную дапамогу, дапамагаюць пераадольваць цяжкасці, натхняюць сваім асабістым прыкладам.

Такімі, напрыклад, з'яўляюцца камуністы калгаса імя Карла Маркса Аршанскага раёна. Няма ніводнай справы, за якую б узяліся камсамольцы арцелі, не параіўшыся з камуністамі. Ды і камуністы не чакаюць, пакуль да іх прыйдуць за парадай. Яны пастаянна ў курсе жыцця моладзі, яе планаў, клопатаў, пошукаў. Сакратар партыйнай арганізацыі Аляксей Канстанцінавіч Стахно ўмела і тактычна падказвае камсамольскаму важаку Аляксандру Лашчыноўскаму, за што трэба брацца ў першую чаргу, як правесці тое ці іншае мерапрыемства, як лепш арганізаваць выхаваўчую работу сярод моладзі. І так паступаюць усе 52 камуністы калгаса, якія трымаюць цесную сувязь з камсамольцамі ў брыгадах.

Камуністы калгаса імя Карла Маркса праяўляюць вялікія клопаты і аб культурным адпачынку, вучобе, ідэйным росце моладзі. Яны чытаюць для іх лекцыі, кіруюць палітгурткамі, дапамагаюць наладзіць работу клубаў і чырвоных куткоў. Дарэчы, па патрабаванню камуністаў калгас набыў для кожнай брыгады радыёлу і гармонік, а ў дзвюх брыгадах ужо ёсць тэлевізары.

Моладзь калгаса, якую ўмела выхоўваюць камуністы, папаўняе рады камсамола. Толькі ў гэтым годзе 28 юнакоў і дзяўчат арцелі атрымалі камсамольскія білеты. Цяпер у калгасе 167 камсамольцаў. Гэта вялікая, дзейсная сіла. Вядучая роля камсамольцаў цяпер адчуваецца ва ўсіх участках вытворчасці. 36 з іх працуе ў жывёлагадоўлі, многія ўзначальваюць звенні, кіруюць брыгадамі, фермамі. А самыя лепшыя, самыя дастойныя папаўняюць рады партыі. Сярод прынятых за апошні час у Камуністычную партыю камсамольцы брыгадзір Пётр Мядзведзеў, загадчыкі ферм Іван Кавалеўскі і Іван Казлоў, учотчык Павел Лукашоў, звеннявая Галіна Аўтухова, свінарка Соф'я Савіцкая і іншыя.

Умелымі важакамі камсамольцаў з'яўляюцца і камуністы Віцебскага завода заточных станкоў, саўгаса «Белае» Полацкага раёна, калгаса імя Энгельса Талачынскага раёна і многіх іншых пярвічных арганізацый.

На жаль, дзе-нідзе за бягучымі гаспадарскімі справамі забываюць аб моладзі, аб рабоце камсамольскіх арганізацый. І гэта недаравальна. Больш шасці месяцаў не было сакратара камсамольскай арганізацыі ў саўгасе «Чырвонабярэзінскі» Докшыцкага раёна, і таму ўся работа арганізацыі была запушчана. Хто вінаваты? На наш погляд, разам з райкомам камсамола адказнасць за адбыўшаеся нясе партыйная арганізацыя саўгаса. А вось другі саўгас гэтага раёна — «Бягомльскі». Тут у першым і трэцім аддзяленнях за цэлы год не было ні аднаго камсамольскага сходу, ні адных палітзаняткаў. І зноў нам думаецца, што вінаваты ў гэтым разам з райкомам мясцовыя камуністы. І ці толькі яны? У пяці пярвічных камсамольскіх арганізацыях Докшыцкага раёна на прайшоўшых справаздачных сходах работа была прызнана нездавальняючай. І за гэта можна сур'ёзна папракнуць і Докшыцкі райком партыі.

XXII З'ЕЗД партыі паставіў перад нашым народам нябачаныя па сваіх маштабах задачы. Выканаць гэтыя задачы немагчыма без росту арганізатарскай работы партыі і яе вернага памочніка — камсамола.

Камсамольцы яшчэ больш уважліва і ўдумліва павінны звяраць свой кожны крок з часам. Сапраўднымі гаспадарамі яны павінны быць на фабрыках і заводах, у калгасах і саўгасах, актыўна змагацца за ўздым прадукцыйнасці працы, за эканомію. Больш канкрэтна, больш прадумана і баявіта павінна весціся работа кожнай камсамольскай арганізацыі.

Яшчэ канкрэтней, яшчэ больш мэтанакіравана і ўмела мы, камуністы, павінны кіраваць камсамольцамі. Выхоўваць у кожным маладым чалавеку стойкага ідэйнага байца, вернага ленінца, заўзята і ўмела вырошчваць камуністычныя рысы характару, рыхтаваць на вялікія здзяйсненні ў імя вялікай мэты — камунізма — такі свяшчэнны абавязак кожнага камуніста.

Мэты, якія паставіў перад народам XXII з'езд партыі, акрыляюць моладзь. У камсамольцаў новыя баявыя планы. На вялікія справы прабуджаюцца іх невычарпальныя творчыя сілы. Верны рулявы камсамола — партыя ўзначаліць гэты магутны парыў свайго баявога памочніка, умела накіруе яго ў адзіны паток вялікай стваральнай энергіі народа — насустрач вясне чалавецтва, насустрач камунізму.